красавік 2022 г.

ГІМНАЗІЯ Г. ДЗЯРЖЫНСКА

ЛАВІ МОМАНТ

ВЫПУСК 6 / ТЫРАЖНАЯ ГАЗЕТА

Вось і надышла апошняя чвэрць у гэтым навучальным годзе! Як хутка бяжыць час! А здаецца, яшчэ зусім нядаўна стаялі на ўрачыстай лінейцы, прысвечанай Дню ведаў. Зусім нядаўна святкавалі Новы год. А зараз растаў снег, бягуць раўчукі, і ў паветры пахне вясной. З'явіліся першыя кветкі - пралескі, распускаюцца пупышкі на дрэвах, гучней спяваюць птушкі. Выдатная пара - пара цвіцення!

А нам час сабрацца з сіламі і выйсці на фінішную прамую, наперадзе канец года!

Гэта заключная чвэрць - чвэрць падвядзення вынікаў! Чаму навучыліся за гэты навучальны год, што карыснага зрабілі, чаго дасягнулі, у чым атрымалі поспех, а ў чым трэба падцягнуцца - якія вынікі будуць у канцы навучальнага года залежыць толькі ад Вас: вучыцеся!

А там ужо можна смела чакаць надыходу лета!

Рэната Генадзьеўна Рудэнка,
рэдактар газеты "Лаві момант"

У ГЭТЫМ КРАСАВІЦКІМ НУМАРЫ:

Вясна, вясна!
Пара кахання! - 2

Ці любіце вы падарожнічаць? - 3

Год гістарычнай памяці - 4-5

Спроба пяра

Прыйшла Вясна
(Казка)

Прайшла зіма. Снег растаў, і з-пад яго віднеецца чорная зямля. У маленькай вёсцы, якая звалася Белая, жыла прыгожая дзяўчынка. Дзяўчыне той было 14 гадоў. Была яна вельмі добрай і прыгожай, усе яе любілі і шанавалі.

Вёска тая была вельмі шчаслівай: ураджай быў добры, жылі ўсе дружна, дапамагалі адзін аднаму, ніколі не сумавалі, пелі песні.

Аднойчы дзяўчынка гуляла з дзецьмі каля возера на камянях. Да іх падыйшоў нейкі стары:

– Добры дзянёк, прыгажуня,- казаў ён.

– Добры, - адказала дзяўчо з прыветлівай усмешкай на твары.

– Гуляеце? А вы ведаеце пра калодеж непадалёк адсюль? – спытаў ён.

– Не ведаем. А што гэта за калодеж? – пацікавіліся дзеці.

Дзед памаўчаў 3 секунды, а потым, уздыхнуўшы, адказаў:

– Калодзеж той чароўны. Той хто ўпадзе ў яго, будзе валодаць сілай магіі, якую ніхто ніколі не бачыў. А знаходзіцца той калодзеж...

Стары змоўк і хітра паглядзеў на дзяцей.

– Знаходзіцца ён на захадзе вёскі, - адказаў ён і ўмомант знік.

Увечары, калі ўсе разыходзіліся па хатах, дзяўчынцы стала вельмі цікава, і яна пайшла шукаць гэты калодзеж.

Роўна ў поўнач яна знайшла яго. Паглядзеўшы ў чорную глыбіню, яна выдыхнула і скокнула туды ў надзеі, што будзе мець моцную магію. Ёй здавалася, быццам яна падае туды вечна, але ў адно імгненне яна пачала падымацца наверх, быццам узляцела...

...Світанак. Свеціць і грэе зямлю сонейка. Жаваранкі пяюць сваю песню. І толькі дзяўчынка, як паўпрыкметны прывід, лётае над зямлёй і маркотна глядзіць на прыроду. Дзе яна не пройдзе, паўсюль будуць квітнець краскі, зелянець траўка. А яе сукенка стала каляровай, ды не простай: калі распускаліся кветкі, сукенка свяцілася белым колерам, калі трава зелянела ¬– то зялёным колерам, а калі на небе сонейка свеціць і грэе, то жоўтым. У яе былі доўгія, шаўкавістыя валасы светла-жоўтага акрасу і вянок з рамонкаў і канюшыны. Вочы былі блакітна-белыя, а пад імі – рабацінне. Дзе б яна ні з'явілася – паўсюль было цёпла, сонечна і радасна.

Вось такім чынам ў вёсцы Белая з'явілася Вясна.

Усніч Лізавета, 6 "А" клас

Вясна, вясна! Пара кахання!

Пасля зімовага сну абуджаецца не толькі прырода, але і чалавечыя пачуцці. Каханне бывае розным... Рамантычным, узнёслым, непрадказальным, эмацыйным і хвалюючым...

Каханне бывае розным... Да хлопца або дзяўчыны, да матулі, да настаўніцы, да Радзімы, роднага кутка, да роднай мовы...

Прызнанне ў каханні матулі

Прывітанне, мая дарагая,мілая матуля!
Я жадаю, каб мой ліст прынёс табе радасць!
Я жадаю табе сказаць вялікі дзякуй за ўсё!
Я люблю кожную рыску твайго твару і твае блакітныя вочы, як нябёсы. У іх адлюстроўваюцца ўсе твае мары і пачуцці. Погляд тваіх вачэй выпраменьвае цяпло, а таксама вельмі добры і ласкавы. У цябе вельмі прыгожыя рукі і чароўная ўсмешка.Я ўдзячны табе за тое, што ты мяне выхавала і надзяліла добрымі манерамі. Ты самая лепшая!

Твой любімы сын-Садоўскі Раман, 7 "В" клас



Родная мова- гэта мова знаёмая кожнаму з маленства. Першае, што чуе маленькае дзіця, калі нараджаецца - гэта ласкавыя словы сваёй матулі. Яно чуе прыгожую родную мову з матчыных песень, цудоўных беларускіх казак, паданняў. Родная мова дапамагае дзіцяці пазнаёміцца з навакольным светам, пазнаёміцца з бытам нашых продкаў. Яна з'яўляецца сродкам захавання народнай культуры і традыцый. З дапамогай роднай мовы мы стасуемся з блізкімі, сябрамі. Трэба любіць і шанаваць родную мову, ганарыцца ёй, садзейнічаць яе развіццю і росквіту.

Варывоцкая Ксенія, 7 "В" клас

Родную мову трэба кахаць!!!



"Не пакідайце роднай мовы, бо для свайго народа тады вы памерлі!" – казаў Ф.Багушэвіч.

Людзі не размаўляюць на беларускай мове. Ёсць шмат прычын гэтаму, напрыклад, каб размаўляць на роднай мове, яе трэба добра ведаць ! У чалавека павінна быць хоць нейкае жаданне размаўляць на ёй.

А галоўнае – трэба яе кахаць!

Я лічу, што гэта не ўсе прычыны, бо гэта залежыць ад пакалення і ад бацькоў. Напрыклад: чаму нашы дзядулі і бабулі размаўляюць на роднай мове? Бо іх прывучылі да яе.

Раней і нават зараз ёсць школы, дзе амаль усе размаўляць на роднай мове. У нашага пакалення бацькі многіх дзяцей гэтым не займаюцца, бо не лічаць гэта сапраўды патрэбным.

Калі мы хочам нешта змяніць і зрабіць так, каб нашу мову не забывалі, трэба прывучаць усіх да яе і ў будучыні сваіх дзяцей таксама.

Дарагуш Валерыя, 7 "В" клас

Беларусь

Белая, мілая, родная зямля.
Ты – крыніца радасці, шчасця і дабра.
Табою ганаруся, цябе паважаю.
Цябе я цалую, мая маладая.

Ад цябе я не адракуся ніколі цяпер.
Ты для мяне, як кніга пра свет.
Мы пад абаронай нашых сяброў,
Мы – міралюбівы, вольны народ.

Мы дапамажам у цяжкі момант.
Ты – маё каханне адной чы знойдзем добры вопыт.
Грошы не такія важныя, як жыццё.
Шануйце прыроду і свой родны Дом!

Лілія Ізмер, 9 "Б" клас

Ці любіце вы падарожнічаць?

Я вельмі люблю.

Асабліва падабаецца падарожнічаць па беларускіх гарадах, гістарычных мясцінах. Новыя гарады, месцы, гістарычыя помнікі- гэта ўсё так займальна і цікава. Нездарма жыццё — гэта пастаянны рух наперад.

МІРСКІ ЗАМАК

Вясной прошлага года я са сваімі аднакласнікамі ездзілі ў Мірскі замак. Спачатку мы прайшлі вакол замка і падышлі да возера. Аб возеры гэтым ходзіць такая легенда.

На сённяшні дзень гэта Мірскае возера, але калісьці там рос выдатны вішнёвы сад. Князь Мікалай Святаполк-Мірскі, тагачасны ўладальнік маёнтка ў Міры, загадаў выкапаць возера, а сад высекчы .

Была вясна, дрэвы пышна цвілі, па народным павер'і вялікі грэх секчы квітнеючыя дрэвы, будзе няшчасце і праклён, і людзі адмовіліся секчы сад. Траціць час на народныя прыметы князь не хацеў, а секчы сад наняў прышлых людзей.

Калі капалі возера, не праходзіла ні аднаго дня без няшчасця, многія людзі загінулі.

Загінуў на будоўлі і сын мясцовай ведзьмы, малады хлопец. Па легендзе на яго ўпала адно з дрэў, і маці гэтага хлопца пракляла возера:

–Хай гэта возера прыме столькі душ, колькі дрэў цвіло ў садзе,—такім было і пажаданне.

Так узнікла легенда аб вішнёвым садзе.

...Далей наша падарожжа завяло нас на вялікі мост, пад якім быў вадаспад. Празрыстая вада цякла і журчэла. Далей мы направіліся ў сам замак.

Каля ўвахода стаяла карэта. У замку было вельмі цудоўна. Вельмі шмат даспехаў і зброі акружалі нас, і мы са здзіўленнем разважалі, колькі ім гадоў.

Нам паказвалі манеты, якія знайшлі на тэрыторіі замка. Яшчэ мы бачылі цагляную сцяну, якой было амаль што 100 гадоў, а то і больш.

Шмат цікавых гісторый мы пачулі, яшчэ больш цікавага пабачылі... Нам вельмі спадабалася гэта падарожжа. Яно было вельмі цудоўным!

Падарожнічайце па сваёй Радзіме, даведвайцеся аб ёй, пранікайцеся гісторыей гэтых месцаў - гэта так цікава!

Усніч Лізавета, 6 "А" клас



Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй сям'і

9 мая 2022 года наша краіна будзе адзначаць 77 гадоў з Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Да, менаваіта 77 мірных гадоў прайшло, як скончылася самая знішчальная вайна.

І з кожным годам усё менш і менш застаецца ўдзельнікаў тых страшных падзей. Тых, хто змагаўся за наша бясхмарнае дзяцінства. Тых, хто можа расказаць пра вайну. Менавіта таму для ўсіх нас важныя ўспаміны ветэранаў, якія перанеслі ўсе нягоды таго складанага часу. Кожны чалавек павінен ведаць сваю гісторыю, ганарыцца подзвігамі сваіх прадзедаў, браць з іх прыклад, каб стаць годным грамадзянінам і патрыётам Беларусі.

Ці знойдзецца ў нашай краіне сям’я, якую не кранула б Вялікая Айчынная вайна? Так, не знойдзецца. Усё насельніцтва краіны прайшло праз вайну. І наша сям'я таксама.

У маёй сям'і ваяваў мой прадзед Ламака Пятро Еўдакімавіч (1926/05/02 - 1995/07/01). Нарадзіўся і вырас у вёсцы Цяўлава Дзяржынскага раёна. Мой прадзед быў вельмі вясёлым і спагадлівым чалавекам. Яго я не паспеў убачыць пры жыцці, але затое мой тата памятае яго вельмі добрым дзядулем.

З першых дзён вайны добраахвотнікам ён пайшоў на фронт. Яму было толькі 15год. Пётр Ламака, нягледзячы на юнацкі ўзрост, стаў удзельнікам многіх значных падзей у гісторыі нашай краіны. Прайшоў усю вайну. Вельмі складана прыйшлося яго сям'і ў тыя гады! Але ніколі яны не скардзіліся і заўсёды любілі сваю Радзіму!

Прадзядуля быў узнагароджаны Ордэнамі Айчыннай Вайны 2 і 1 ступені, медалём за ўзяцце Берліна, медалём за вызваленне Варшавы, медалём за перамогу над Германіяй і медалямі за Адвагу.

Яшчэ адзін цікавы факт з жыцця майго прадзядулі... Падчас вайны прадзед быў ранены. Але пра гэта ён ніколі не казаў. Паўстагоддзя прадзядуля жыў з мінным асколкам у лапатцы. Ніхто з нашай сям’і пра гэта не ведаў, а даведаліся толькі пасля яго смерці, калі пачалі разбіраць рэчы. Што кіравала дзядулем, чаму ён так і не расказаў аб ваенным трафеі? На жаль, мы так і не даведаліся.

Мой тата зараз прыгадвае, з якім гонарам ён ішоў за руку з дзедам на парадзе да дня Перамогі 9 мая, бо грудзі дзеда Пятро былі ўсе ўвешаны ордэнамі, медалямі і іншымі нагруднымі знакамі.

Прадзядуля заўсёды працаваў на карысць людзей. Ён быў міліцыянерам.

Я вельмі ганаруся сваім прадзядулем, як і ўся мая сям'я.

Яшчэ я б хацеў закрануць праблему сучаснага грамадства. Чаму многія людзі ўспамінаюць ветэранаў толькі напярэдадні свята 9 мая? На шчасце, знаходзяцца і неабыякавыя людзі, усяляк дапамагаюць ветэранам у падзяку за тое, што зрабілі яны для кожнага з нас, за тое, што падарылі нам свабоду і права жыцця на мірнай зямлі.



Навошта трэба памятаць пра вайну? Я перакананы, што подзвігі кожнага з гэтых людзей павінны жыць у нашых сэрцах вечна. Подзвіг нашых продкаў мы будзем памятаць і ніколі не забудзем, бо яго здзяйснялі не мужныя волаты, ці супермэны, а звычайныя людзі. А гэтыя людзі сталі героямі, бо жыццё іх было асветлена высокай мэтай. Мэтай незалежнасці Радзімы!

Мае блізкія і родныя старэйшага пакалення з'яўляюцца для нас, ўнукаў і праўнукаў, сапраўдным прыкладам працавітасці, любові і павагі. Наша пакаленне імкнецца быць падобнымі на іх. У сапраўдны момант у нашай вялікай сям'і сем унукаў і трынаццаць праўнукаў. Нам ёсць - чым ганарыцца! Нам ёсць, у што верыць!

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ НАШАЙ СЯМ'І

Многія кажуць, што сям'я — гэта самае галоўнае ў жыцці. І я з гэтым цалкам згодны.

Сям'я - гэта не проста сваякі, якія жывуць побач. Гэта блізкія людзі. Дзякуючы традыцыям, якія існуюць у сям'і, мы вучымся любіць, паважаць, дапамагаць адзін аднаму. А гэта-самае галоўнае ў жыцці. Захоўваць сямейныя рэліквіі - гэта выдатная традыцыя, якая ёсць у шматлікіх сем'ях, у тым ліку і нашай.

Без мінулага свет пусты для людзей, без мінулага няма і будучыні. У кожнай сям'і, у кожным доме ёсць свая Сямейная рэліквія. Рэліквіі - гэта прадметы, асабліва паважаныя і захоўваемыя як памяць пра мінулае. Яны дапамагаюць зразумець, што жыццё чалавека бясконцае, калі пра яго памятаюць нашчадкі. Рэліквіі дазваляюць дакрануцца да гісторыі сям'і і адчуць, што яна нам блізкая, што яна закранае і наша жыццё, уплывае на ўсё, што адбываецца сёння.

Я вельмі ганаруся тым, як беражліва наша сям'я захоўвае памяць пра продкаў у выглядзе рэчаў. У нас захоўваюцца і фотаздымкі, і франтавыя лісты, і посуд, і вышыванкі. Мама лічыць, што гэта заслуга маёй прабабулі, якая змагла прывіць даніну павагі да сямейных традыцый, а мы перадаем іх з пакалення ў пакаленне. Звяртаючыся да іх, мы заўсёды будзем памятаць пра нашых продкаў, і аб унікальным мінулым нашай краіны.

Сямейныя рэліквіі - агеньчыкі нашай памяці. Сёння запальваем іх мы з вамі. Захоўвайце гісторыю свайго роду, сваёй сям'і для будучых пакаленняў!

Артыкулы падрыхтаваў Змачынскі Ілья, 5 "М" клас

Шпаргалка на ўсё жыццё

ПАКІНУЦЬ ЗАРАДКУ = ЗАСТАЦЦА БЕЗ...

... даху над галавой, а яшчэ страшней без блізкага чалавека. Калі вы да гэтага часу пакідаеце провад у сеткі пасля зарадкі тэлефона-тады мы раскажам вам пра наступствы.... ШТО Ж МОЖА АДБЫЦЦА:

- у кожнай прылады ёсць свой рэсурс бесперапыннай працы, і, пакідаючы "тырчаць" зарадку ў сеткі, Вы скарачаеце гэты тэрмін. Па яго заканчэнні ніякіх гарантый бяспечнай працы не будзе;
- у любой няштатнай сітуацыі ў сеткі (аварыйны рэжым працы, перапады напружання, удар маланкі) залішняе напружанне прыйдзе ў самы маламагутны прыбор, якім з'яўляецца ваша зарадная прылада, і пачне яго грэць;
- якой бы "фірмовай" ні была зарадная прылада-яе выкарыстоўваюць людзі, гэта значыць не выключаны выпадкі пашкоджання самой прылады і яе элементаў, што можа прывесці да кароткага замыкання і загарання.

Што будзе далей - залежыць ад таго, дома вы ці не, паспееце ці зрэагаваць, наколькі гаручыя прадметы знаходзяцца побач з зарадкай і г .д.

!!ВЫСНОВА: Зарадзіў тэлефон? Пабары ляноту і дастань зараднку з разеткі!

І.В.Фурса, педагог сацыяльны

РАНІШНЯЯ ГІМНАСТЫКА АД РЫГОРА ОСТЭРА

1. Вазьміцеся за розум.
2. Паварушыце мазгамі.
3. Спінны мозг трымаеце прама, галаўны адкіньце назад.
4. Пачынаем кругавыя рухі розуму.
5. Пракручваем у галаве ўсё, што здарылася.
6. Не напружваем задні розум, не варта– гэта трэба было рабіць раней.

7. Пальцы не сціскаюцца ў кулакі.
8. Не трэба нічога прымаць блізка да сэрца.



9. Працуем толькі галавой.
10. Не забывайце глыбока і роўна дыхаць. Успомнілі-удых. Жахнуліся-выдых. Апошні раз жахнуліся, зрабілі правільны вывад і выкінулі ўсе з галавы.



Будзьце, як надвор'е!
Яму абсалютна
ўсё роўна,
Падабаецца
ЯНО камусь -
небудзь ці не.

ГАЗЕТА ГІМНАЗІІ Г. ДЗЯРЖЫНСКА "ЛАВІ МОМАНТ" № 6", КРАСАВІК 2022
ВЫХОДЗІЦЬ 1 РАЗ НА МЕСЯЦ
НАШ АДРАС: МІНСКАЯ ВОБЛ., Г. ДЗЯРЖЫНСК, ВУЛ. 1-Я ЛЕНІНСКАЯ, 21
ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР ГАЗЕТЫ, КІРАЎНІК АБ'ЯДНАННЯ ПА ІНТАРЭСАХ "ЮНЫ ЖУРНАЛІСТ" РУДЭНКА Р.Г.